# Рецензии

# Рэцэнзіі

# Reviews

*Citko L.* **Piśmiennictwo i nazewnictwo starobiałoruskie na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego. Wybrane problemy.** Białystok : Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2019. 293 s.

*Citko L.* **The old Belarusian literature and naming convention in the Grand Duchy of Lithuania. Selected guestions.** Białystok : Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2019. 293 p.

Старабеларуская літаратурна-моўная спадчына ўжо не адно дзесяцігоддзе прыцягвае пільную ўвагу вучоных-лінгвістаў і служыць крыніцай шматлікіх айчынных і замежных даследаванняў. Працэсы складвання беларускай старалітаратурнай мовы класічна-кніжнай фармацыі прааналізаваны на сённяшні дзень вельмі грунтоўна ў самых розных аспектах, але гэта тэматыка ў мовазнаўстве не траціць значнасці і перспектыўнасці. Па-ранейшаму актуальным застаецца вывучэнне і пашырэнне ў навуковым ужытку здабыткаў тагачаснага пісьменства, бо менавіта мінулае дапамагае раскрыць шляхі эвалюцыі любой мовы і прадказаць яе далейшы лёс. Дакладныя навуковыя звесткі пра стан, тыпы і адметнасці беларускай мовы старажытнай пары ў вяршынны перыяд яе станаўлення, пра характар яе змяненняў на ўсіх узроўнях уяўляюць сабой несумненны ўнёсак у гістарычную навуку аб мове. Акрамя таго, даныя такога кшталту праясняюць разуменне храналагічных узаемаадносін і прычынна-выніковых залежнасцей паміж living рознымі этапамі фарміравання моўнай сістэмы, а гэта спрыяе аб'ектыўнай інтэрпрэтацыі многіх сённяшніх моўных з'яў. У больш шырокім гуманітарным плане ўлік шматвяковых традыцый беларускай кніжнасці, паказ укладу продкаў беларусаў у агульнаславянскую моўна-гістарычную скарбніцу выступае неабходным элементам сацыяльных праграм, прысвечаных развіццю беларускай нацыянальнай культуры і асветы.

Адпаведна вышэйсказанаму варта шчыра вітаць выхад у свет манаграфічнага выдання «Старабеларускае пісьменства і анамастыка на землях Вялікага Княства Літоўскага. Выбраныя праблемы» прафесара Беластоцкага ўніверсітэта Ліліі Цітка, знанага спецыяліста па анамастыцы і гісторыі мовы, чые навуковыя зацікаўленні даўно і цесна звязаны з беларусістыкай.

У кнізе праведзены сістэмны аналіз старабеларускай мовы і анамастыкі перыяду Вялікага Княства Літоўскага на матэрыяле такіх перакладных, лексікаграфічных і летапісных крыніц XV–XVIII стст., як «Беларускі Трыстан» (манускрыпт XVI–XVII стст. з пазнанскага Кодэкса Рачыньскіх, які, дарэчы, дзякуючы намаганням аўтара рэцэнзуемай манаграфіі ў 2018 г. быў выдадзены ў выглядзе факсіміле з далучэннем графічна адаптаванага варыянта, а таксама тлумачэнняў і перакладу на польскую мову), «Лексис с толкованием словенских мов просто», «Лексис из слове(н)ского языка» Лаўрэнція Зізанія, «Лексикон словенороссский и имен толкование» Памвы Бярынды, «Синонима славенороссская», супрасльскі «Лексікон», Хроніка Быхаўца, гарадзельскія актавыя запісы. Такім чынам, фактычная база на ўказаным даследчым полі, раней прадстаўленая пераважна тэкстамі рэлігійнай і прававой аднесенасці, узбагацілася творамі іншай жанравай прыналежнасці і анамастычнымі тэкстамі, што, бяс-



CC BY NC

спрэчна, дае магчымасць атрымання новых ведаў і стварэння новых арыгінальных высноў.

У манаграфіі слушна ўлічаны той факт, што развіццё мовы і ўдасканаленне кампанентаў яе сістэмы, як вядома, падпарадкоўваюцца не толькі ўнутраным законам, але і залежаць ад аб'ектыўных знешніх фактараў моўнага функцыянавання. У кнізе прафесара Л. Цітка непасрэдны мовазнаўчы аналіз падаецца на шырокім фоне складанай сацыяльна-палітычнай і грамадска-культурнай сітуацыі ў ВКЛ – поліэтнічнай, поліканфесійнай і шматмоўнай дзяржаве. Такі падыход, пры якім моўныя з'явы і працэсы ўпісваюцца ў пазамоўны кантэкст, разглядаецца праз культурна-гістарычную прызму, на сённяшні дзень з'яўляецца вельмі перспектыўным і знаходзіць усё больш прыхільнікаў у лінгвістычным асяродку.

Паколькі многія крыніцы манаграфічнага даследавання прафесара Л. Цітка геаграфічна звязаны з Падляшшам, у кнізе абазначаны спецыфічны статус гэтага этна-рэлігійна-палітычнага рэгіёна, які, як піша аўтар, знаходзіцца на мяжы хрысціянскага Усходу і Захаду. Прычым мяжа гэта не толькі падзяляе славян, але і фарміруе ўнікальную прастору славянскага сутыкнення і кантакту, што робіць створаныя тут тэксты надзвычай інфарматыўнымі для высвятлення міжславянскіх узаемаадносін.

Асноўная частка рэцэнзуемай манаграфіі складаецца з двух раздзелаў. У першым з іх аб'ектам грунтоўнага навуковага аналізу абрана мова пералічаных вышэй арыгінальных помнікаў беларускай белетрыстыкі, летапісання і лексікаграфіі. Усе крыніцы скрупулёзна даследаваны на розных узроўнях мовы – фанетычным, марфалагічным і лексічным. Падрабязна разглядаюцца праявы польскага ўплыву на мову канкрэтных помнікаў, у тым ліку аналізуецца роля польскай мовы як пасрэдніцы, што робіць несумненны ўнёсак у гісторыю беларуска-польскіх кантактаў. На наш погляд, вельмі пахвальным з'яўляецца ўключэнне ў навуковы аналіз моўнага матэрыялу з твораў слоўнікавага тыпу, паколькі кожны дасканала выкананы слоўнік – гэта не толькі скарбніца моватворчасці народа, яго нацыянальнай культуры, але і свайго роду духоўны арыенцір, і інтэлектуальны капітал нацыі.

Стан мовы, адлюстраваны ў даследаваных тэкстах, дае падставы сцвярджаць, што перыяд ВКЛ – сапраўды так званы залаты век беларускага пісьменства, літаратуры і культуры. Зафіксаваныя рысы жывой мовы ў тагачасных крыніцах дадаюць новыя факты для вырашэння праблемы пераемнасці, паколькі паказваюць адсутнасць татальнага разрыву паміж старой і новай беларускай літаратурнай мовай нават у пісьмовай версіі.

Другі раздзел манаграфічнага даследавання прысвечаны разгляду анамастычных працэсаў у мове перыяду ВКЛ. Аналіз у ім грунтуецца ў асноўным на матэрыялах з тэрыторыі Падляшша, што выглядае цалкам апраўданым, паколькі гэты рэгіён – не проста адміністрацыйная, але і арганічная моўнаэтнічная частка старажытнай дзяржавы. У ходзе даследавання аўтар звяртае ўвагу на разнастайныя тыпы дзвюх асноўных анімічных разнавіднасцей – антрапонімаў і тапонімаў. Антрапанімія прадстаўлена асабовымі імёнамі, адтапанімічнымі, патранімічнымі, адапелятыўнымі, геральдычнымі найменнямі рознай матывацыі. Прычым вельмі цікава, што ў манаграфіі робіцца спроба падзяліць названыя сродкі іменавання ў залежнасці ад таго, якую грамадскую групу яны абслугоўваюць і ідэнтыфікуюць (польскую або літоўска-рускую шляхту). Тапанімія (у тым ліку мікратапанімія і ўрбананімія) вывучана ў некалькіх аспектах: як лексічная група, што прэзентуе факты грамадска-культурнага, сацыяльнага і нават ментальнага характару, як звод найменняў з рознай матывацыйнай асновай, як сістэма адзінак, што захоўваюць многія дыялектныя і архаічныя моўныя рысы. Прааналізаваная прапрыяльная лексіка дазволіла вызначыць як спецыфіку іменалогіі на тэрыторыі памежжа, так і ўніверсальныя мадэлі намінацыі і супольныя для ўсяго ВКЛ анімічныя тэндэнцыі, абумоўленыя аналогіямі ў спосабах канцэптуалізацыі навакольнай рэчаіснасці беларусамі, палякамі і балтамі.

Манаграфія вельмі дарэчна суправаджаецца індэксамі прааналізаваных словаформаў і онімаў (асобна лаціна- і кірылічнааформленых). Наяўнасць такіх сістэматызаваных спісаў дае магчымасць уявіць базавы аналітычны аб'ём і істотна спрашчае для карыстальніка пошук навуковых інтэрпрэтацый у тэксце кнігі.

Хацелася б спецыяльна адзначыць навукова карэктнае, са спасылкамі на аўтарытэты, абыходжанне аўтара манаграфіі з тэрмінамі (у прыватнасці, лінгвонімамі) і азначэннямі паняццяў, асабліва з тымі, якія ў славянскай лінгвістыцы яшчэ не атрымалі ўстойлівай адназначнай кваліфікацыі (напрыклад, простая мова, старaруская мова). Такі ж абачлівы падыход адзначаецца ў ходзе аналізу працэсаў запазычвання пры вызначэнні надзвычай складанага пытання аб мовах-крыніцах і мовах-пасрэдніцах.

Рэцэнзуемае выданне вызначаецца наяўнасцю прадстаўнічай навуковай базы. У тэкст уключана вялікая колькасць спасылак на навуковыя працы па разглядаемай тэматыцы, прычым не ў выглядзе простага пераліку, а ў аналітычным кантэксце. Аўтар праводзіць аналіз (часам абгрунтавана крытычны) работ сваіх папярэднікаў (з улікам самых найноўшых) і абавязкова рэзюмуе яго вынікі, выказваючы свой погляд на праблему.

У заключэнне адзначым, што навуковая эрудыцыя, прафесійная кампетэнтнасць і грунтоўныя веды аўтара манаграфіі прафесара Л. Цітка дазволілі стварыць цікавае, глыбокае па змесце шматпланавае даследаванне, якое мае важнае значэнне не толькі для беларусістыкі, але і для славістыкі ўвогуле, паколькі дае магчымасць па-новаму паглядзець на многія працэсы, што адбываліся на кантактных славянскіх тэрыторыях, ацаніць паказчыкі міжславянскага моўнага ўзаемадзеяння і вынікі ўзаемаадносін славянскіх моў з мовамі іншых груп.

***І. А. Гапоненка***[1]

[1]*Ирина Олеговна Гапоненко* – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Ірына Алегаўна Гапоненка* – доктар філалагічных навук, прафесар; прафесар кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Iryna A. Haponenka*, doctor of science (philology), full professor; professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.